# Паэт шчырых радкоў

***23 сакавіка вядомаму мазырскаму паэту, кандыдату філалагічных навук, былому дацэнту Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя І. П. Шамякіна Анатолю Малюку споўнілася 85 гадоў. Напярэдадні ў Мазырскай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя А. С. Пушкіна адбылася творчая сустрэча з Анатолем Казіміравічам.***



Анатоль Малюк нарадзіўся на Гродзеншчыне, у Воранаўскім раёне. Пасля заканчэння Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута працаваў некаторы час дырэктарам школы, потым выкладчыкам інстытута, паралельна навучаўся ў аспірантуры. У інстытуце, які пазней стаў універсітэтам, выкладаў сучасную беларускую мову, стылістыку, лінгвістычны аналіз мастацкага тэксту. За шматгадовую добрасумленную працу ўзнагароджаны Ганаровай граматай Міністэрства асветы Беларускай ССР, медалём «Ветэран працы» і знакам «Выдатнік народнай адукацыі БССР».

Вольныя хвіліны Анатоль Казіміравіч аддае паэзіі. Яго вершы друкаваліся ў рэспубліканскіх часопісах і газетах, у калектыўных зборніках «Дзень паэзіі», «Палескія перазвоны», «Ты, Мазыр, – мой Парнас», «Сонца над буслянкай», «Прыпяцкія хвалі». У 2014 г. выйшаў зборнік яго вершаў «Дабравесце».

*«Вершы Анатоля Малюка,* – адзначаў у пасляслоўі “Шчырасць кожнаму радку” рэдактар зборніка, паэт Анатоль Бароўскі, – *пакідаюць прыемнае ўражанне перш за ўсё тым, што яны адразу бяруць у палон, прымушаюць думаць нават пры беглым знаёмстве: яркая, запамінальная вобразнасць, высокі энергетычны патэнцыял экспрэсіі, заглыбленасць падтэксту, эмацыянальнае ўжыванне некаторых лексічных адзінак у спалучэнні з рацыянальнай асновай – усё гэта робіць творы паэта сэнсавызначальнымі і значымымі ў ідэйна-тэматычным і мастацка-эстэтычным плане».*

Творы Анатоля Малюка разнастайныя па змесце. Шмат вершаваных радкоў прысвечана Мазыру – гораду, які стаў для паэта родным. Таму так шчыра, непадкупна гучаць яго радкі:

*Нізкі паклон табе,*
*любы мой краю,*
*Хай будуць заручаны*
*шчасце і мір.*
*Люблю я цябе*
*і цябе абдымаю,*
*Сталіца палескага краю –*
*Мазыр.*

Глыбокімі патрыятычнымі пачуццямі поўняцца вершы пра Радзіму. Любоўю пранізаны прыродаапісальныя вершы. З’явы прыроды адухаўляюцца, у якасці метафар выкарыстоўваюцца індывідуальна-аўтарскія неалагізмы, напрыклад, *веснадром*, выклікаючы разнастайныя асацыяцыі. Многія творы паэта мясцовымі кампазітарамі пакладзены на музыку, бо яны па форме надзвычай меладычныя, а па змесце – светлыя і цёплыя.

Іншы раз Анатоль Казіміравіч эксперыментуе, ужываючы кожнае слова ў вершы з адной і той жа пачатковай зычнай літарай. Гэты прыём гукапісу – алітэрацыя – дапамагае ўзмацніць інтанацыйна-гукавую выразнасць верша, надаць яму асаблівую мілагучнасць.

У 2018 г. Анатоль Малюк за ўласныя сродкі выдаў кнігу для дзяцей «Матылёк і Сонейка», у якую ўвайшлі вершы пра *«жывёл і птушак, камароў і мушак»*, пейзажныя замалёўкі, жарты-смяшынкі, загадкі, задачкі, лічылкі, байкі, казкі. Гэтыя творы вызначаюцца шчырасцю, дакладнымі рытмам і рыфмай. Вось, напрыклад, загадка пра козліка:

*Хто гэта ля хаты*
*Бегае цыбаты?*
*Тоненькія ножкі,*
*Маленькія рожкі,*
*А сам – барадаты?*

...На сустрэчы з чытачамі Анатоль Казіміравіч закрануў шмат праблем, што хвалююць яго як грамадзяніна, паэта і чалавека, прачытаў свае вершы. Удзячныя чытачы выказалі яму шмат цёплых, добрых слоў.

*Аляксей СОЛАХАЎ*
*Фота аўтара*